*А. С. Лаўрыновіч*
Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі,
Мінск, Беларусь

*A. Laurynovich*
National Centre for Art Creativity of Children and Youth,
Minsk, Belarus

**УДК 378.18:304.44:94(476)**

# ФАРМІРАВАННЕ КАШТОЎНАСНАГА СТАЎЛЕННЯ МОЛАДЗІ ДА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

# FORMATION OF THE VALUE ATTITUDE OF YOUTH TO THE HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE OF THE BELARUSIAN PEOPLE

*Сучасная сістэма выхавання моладзі патрабуе актуалізацыі формаў, мабілізацыі наяўных рэсурсаў, распрацоўкі прынцыпова новых падыходаў, тэхналогій, інавацый-выклікаў. Прапанаваны вопыт рэалізацыі міжнароднага культуралагічнага праекта, накіраванага на ўдасканаленне сістэмы мастацка-эстэтычнага выхавання студэнцкай моладзі на аснове фарміравання каштоўнасных адносін да сусветнай і айчыннай гісторыка-культурнай спадчыны і акцэнтаванне ў свядомасці моладзі значных у беларускай культуры асоб і іх філасофска-творчых ідэй, магчымы да адаптацыі і паспяховага прымянення ва ўмовах устаноў вышэйшай адукацыі.*

*Ключавыя словы: выхаванне, культуралагічны падыход, гісторыка-культурная спадчына, інавацыйныя тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці.*

*The modern youth education system requires actualization of forms, mobilization of available resources, development of fundamentally new approaches, technologies, innovations, challenges. The suggested experience of implementing the International Cultural Project, which is aimed at improving the system of artistic and aesthetic education of student youth on the basis of formation of a value attitude to the world and national historical and cultural heritage and emphasizing important individuals in the Belarusian culture and their philosophical and creative ideas in the minds of young people, is possible to adapt and successfully put into practice in the higher education institutions.*

*Key words: upbringing, cultural approach, historical and cultural heritage, innovative technologies of sociocultural activity.*

Сучасны сацыякультурны кантэкст, глабалізацыйныя працэсы, урбанізацыя, віртуалізацыя і лічбавізацыя ўсіх сфер жыцця ўплываюць на фарміраванне прыярытэтаў і цэннастных арыенціраў, сістэмы ўзаемаадносін моладзі. Такім чынам фарміруецца светапогляд цэлага па-

калення. Шоўізацыя, вестэрнізацыя, камерцыялізацыя культуры і вольнага часу стварылі спрыяльныя ўмовы для існавання чалавека з новымі сацыякультурнымі паводзінамі – пасіўнага спажыўца ўніфікаванага забаўляльнага прадукту.

Сістэма выхавання моладзі патрабуе не проста актуалізацыі існуючых форм, а мабілізацыі ўсіх рэсурсаў, распрацоўкі прынцыпова новых падыходаў, тэхналогій, іннавацый-выклікаў.

Зыходзячы з дадзенай стратэгічнай задачы, Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі распрацаваны, апрабаваны і з 2016 года паспяхова рэалізуецца міжнародны культуралагічны праект «Грані творчасці» з удзелам студэнцкай моладзі.

Мэта міжнароднага культуралагічнага праекта – актуалізацыя і ўдасканаленне сістэмы мастацка-эстэтычнага выхавання студэнцкай моладзі на аснове фарміравання каштоўнасных адносін да сусветнай і айчыннай гісторыка-культурнай спадчыны.

Задачы праекта: далейшае развіццё відава-жанравага дыяпазону аматарскай творчасці, прапаганда сучасных напрамкаў і лепшых узораў мастацкай творчасці, у тым ліку з выкарыстаннем IT-тэхналогій; стварэнне аптымальных умоў для развіцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі; інтэнсіфікацыя крос-культурнага ўзаемадзеяння; устанаўленне і развіццё міжкультурных кантактаў сярод прадстаўнікоў моладзі з розных краін; укараненне ў практыку інавацыйных і эфектыўных форм сацыякультурных камунікацый студэнцкай моладзі.

Культуралагічны праект «Грані творчасці» вылучаецца сярод іншых праектаў тым, што ён не проста цікавы для ўдзельнікаў, як шматлікія творчыя праекты, дзе маладым людзям прапаноўваецца ў накірунках сучаснай творчасці праілюстраваць вельмі суб’ектыўныя фантазіі, ці конкурсы, у якіх задаецца вельмі вузкая тэма і тэхніка выканання.

Прадстаўляемы праект мае тую шырыню і ўніверсальнасць, якія рэдка знойдзеш у конкурсах, і мае значна большыя інтэнцыі, чым проста развіццё творчых здольнасцей моладзі.

У праекце «Грані творчасці» выкарыстаны аўтарскія распрацоўкі і інавацыйныя сацыякультурныя тэхналогіі, творчы эксперымент.

Сэнсавай і канцэптуальнай асновамі праекта з’яўляюцца беларуская літаратура і сучасныя накірункі візуальнай творчасці.

Творы класікаў беларускай літаратуры, напісаныя паэтычна ці празаічным тэкстам, кожным удзельнікам праекта-студэнтам прачытваюцца па-свойму і выяўляюцца ў крэатыўным візуальным рашэнні, зыходзячы з прапанаванага літаратурнага тэксту.

У выніку нараджаецца прынцыпова новы тэкст – візуальны тэкст-сэнс.

Безумоўна, кожны студэнт у рамках школьнай праграмы ажыццяўляў знаёмства з беларускай літаратурай. Таму беларуская літаратура – гэта не прынцыповае адкрыццё для студэнтаў – удзельнікаў культуралагічнага праекта.

У рамках праекта студэнтам самых розных спецыяльнасцей, у тым ліку тэхнічных, даецца магчымасць пашырыць веды пра творчасць беларускіх  пісьменнікаў і паэтаў: для асэнсавання прапаноўваюцца творы з па-за школьнай праграмы. І, што не менш важна, пры адборы твораў арганізатары праекта арыентуюцца на тое, каб гэтыя творы былі актуальныя менавіта для студэнцкага ўзросту, для моладзі.

Таксама для ўдзельнікаў праекта арганізатарамі вызначаюцца не формы і мастацкія тэхнікі, а менавіта вектары, накірункі творчасці, прапаноўваецца магчымасць выбраць самы цікавы паэтычны ці празаічны твор, эмпатычны, які студэнт зможа даследаваць, а ў далейшым праз візуалізацыю выказаць свае адчуванні, роздумы, сумненні, вырыянты. Гэта ўжо аўтарскі адказ маладога чалавека на прапанаваны твор і адначасова творчы мэсэдж гледачу, які таксама запрашаецца як суразмоўца ў дыялог мастацтва і часу.

Студэнт у рамках праекта «Грані творчасці» не робіць літаральную ілюстрацыю тэксту. На аснове прапанаванага тэксту-сэнсу ён пачынае ствараць свой новы сэнс, прапаноўвае свой візуальны варыянт – як гэта можа быць. І ў выніку нараджаецца абсалютна новы сэнс. Часта мы сутыкаемся з тым, што на той ці іншы твор студэнтам прапаноўваецца настолькі цікавае рашэнне, што судакрананне з першасным сэнсам нам, гледачам, трэба яшчэ і пашукаць. Студэнты не ствараюць у сваіх мастацкіх работах нешта супрацьлеглае прачытанаму тэксту, але яны іншым разам настолькі глыбока сыходзяць менавіта ва ўласнае творчае рашэнне, што проста немагчыма не захапляцца і не здзіўляцца.

Створаныя студэнтамі лепшыя творчыя работы штогод экспануюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Экспанаванне ў выставачных галерэях Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі павышае статус даннага праекта і статус мастацкай творчасці студэнтаў.

Пасля экспанавання ў бібліятэцы – другая частка праекта.

Праект здзяйсняе падарожжа па ўстановах вышэйшай адукацыі нашай краіны ў форме культурна-асветніцкай акцыі.

У выставачных галерэях універсітэтаў на базе экспазіцыі студэнты педагагічных спецыяльнасцей праводзяць мерапрыемствы для навучэнцаў устаноў сярэдняй адукацыі з мэтай апрабацыі новых падыходаў, актуалізацыі педагагічных практык і ўкаранення інтэрактыўных культурна-асветніцкіх формаў.

За два гады ўжо 10 універсітэтаў у розных рэгіёнах Беларусі станавіліся творчымі пляцоўкамі праекта.

Такім чынам, ён ператвараецца ў своеасаблівую культурную хвалю, у рамках якой студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі праводзяць для навучэнцаў школ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, прафесійна-тэхнічных каледжаў розныя культурныя мерапрыемствы, творчыя сустрэчы з аўтарамі работ, маладымі мастакамі, дыскусіі, лек-

цыі-паказы ад прафесійных мастакоў на базе экспазіцыі, якая падарожнічае па краіне.

Дадзены праект уключае ў сябе міжнародную частку і дае студэнтам магчымасці міжнароднага міжкультурнага творчага палілогу.

Праект «Грані творчасці» разлічаны на 10 гадоў і заклікаваны акцэнтаваць у свядомасці моладзі пэўных значных для беларускай культуры асоб і іх філасофска-творчыя ідэі. Кожны наступны год знакавай персонай праекта будзе нейкі канкрэтны літаратар, асветнік, творца.

За гэты 10-гадовы перыяд арганізатарамі суместна са студэнтамі-аўтарамі плануецца сфарміраваць своеасаблівую галерэю творчасці вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў і іх літаратурных герояў-вобразаў у асэнсаванні маладымі людзьмі.

Пазначыўшы канцэптуальныя асновы, разгледзім вопыт рэалізацыі практа.

Праект стартаваў ў 2016 годзе са знакавай асобы – самага маладога, 25-гадовага класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча, 125-годдзе з дня нараджэння якога святкавалася ў 2016 годзе.

У гэты творчы год паэтычныя вобразы і мары маладога чалавека былі прадстаўлены ў прачытанні сучаснага студэнства. Тэма-дэвіз выставы 2016 года «БАГДАНОВІЧ. МАЛАДЫЯ ЖАДАННІ» была сфарміравана на падставе паэтычнага твора М. Багдановіча «Маладыя гады, маладыя жаданні…».

Ілюстрацыі да твораў паэта былі выкананы з выкарыстаннем разнастайных тэхнік выяўленчай творчасці, а таксама накірункаў сучаснага мастацтва ў наступных намінацыях.

Аснову намінацыі «Летэрынг – «Вянок ВЯНКОЎ» складала тэхніка малявання словамі: стварэнне гарманічных кампазіцый з графічнага малюнка і цытаты М.Багдановіча.

У намінацыі «Фота-альтэрнат «Я ХАЦЕЎ БЫ СПАТКАЦЦА З ВАМІ ...» прадстаўлены фотаработы студэнтаў, створаныя на аснове фрагмента аднайменнага твора.

Канцэптуальны візуальны сэт «СПАСЦІЖЭННЕ КРАСЫ» – гэта аўтарскія ілюстрацыі студэнтаў, заснаваныя на візуалізацыі зместу і мастацкіх вобразаў твораў паэта.

У другой частцы практа – культурна-асветніцкай акцыі – прынялі ўдзел і размясцілі экспазіцыі Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны, Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова, Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава, Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.

У трэцяй частцы праекта ў 2016 годзе ў міжнароднай частцы – у крос-культурным палілозе прынялі ўдзел установы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі – гарадоў Ялта і Яраслаўль, з якімі быў звязаны жыццёвы і творчы шлях М. Багдановіча.

У 2017 годзе ў цэнтры ўвагі быў жыццёвы і асветніцкі шлях Францыска Скарыны і наогул феномен беларускага кнігадрукавання ад часоў Скарыны да нашых дзён.

Таму праект 2017 года быў прысвечаны чалавеку эпохі вялікіх геаграфічных адкрыццяў, эпохі росквіту творчасці і гуманізму, адкрыцця новых магчымасцей у навуках і мастацтвах, найбуйнейшаму і яскраваму прадстаўніку беларускай культуры – Францыску Скарыне.

У рамках праекта сучасная студэнцкая моладзь часу вялікіх інтэлектуальных дасягненняў, росквіту тэхнічных магчымасцей і лічбавых тэхналогій распачала своеасаблівы дыялог, дзе суразмоўцамі выступаюць час і чалавек: час як эпоха і як магчымасць, і чалавек, які прысвяціў сваё жыццё спасціжэнню адвечных ісцін і сэнсам жыцця абраў служэнне народу.

Праз пяць стагоддзяў студэнты спрабавалі знайсці своеасаблівыя ключы ведаў і мудрасці і адказаць на пытанне: які ён – чалавек дасканалы.

Адкрыць шматгранны свет гуманіста і чалавека, сферы яго разнастайнай дзейнасці, не страціўшай сваёй актуальнасці сёння, яго ведаў і вялікага духоўнага шляху – у гэтым ідэя Міжнароднага культуралагічнага праекта «Грані творчасці», тэма-дэвіз якога – «ФРАНЦЫСК СКАРЫНА. ЧАЛАВЕК ДАСКАНАЛЫ».

У 500-годдзе стварэння першай друкаванай кнігі Беларусі сучаснае беларускае студэнцтва ў новым прачытанні прадставіла культурную спадчыну Францыка Скарыны праз наступныя намінацыі.

Аснову творчай работы ў намінацыі «Летэрынг – «Я, ФРАНЦІШАК, СКАРЫНІН СЫН…» склала тэхніка малявання словамі, у якой тэкст, цікавыя графічныя формы з’яўляюцца мастацкімі аб’ектамі і раскрываюць сэнс цытаты Ф. Скарыны «…і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць».

У намінацыі «Буквіца – «ДРУКАВАНАЕ СЛОВА. ВЯЛІКІЯ ЛІТАРЫ» ілюстрацыі твораў, прысвечаных беларускімі паэтамі і пісьменнікамі Ф. Скарыне, былі створаны ў выглядзе малюнкаў з арнаментальна-дэкаратыўнай ці сюжэтнай кампазіцыяй, якая разгортваецца вакол «ініцыяла», першай вялікай літары тэксту і адлюстроўвае змест канкрэтнага літаратурнага твора.

Намінацыя «Фота-альтэрнат «КРЫНІЦА МУДРАСЦІ, ВЕДАЎ І НАВУКІ, ЛЕКІ ДЛЯ ДУШЫ» накіроўвала студэнтаў да асабістай бібліятэкі з мэтай знайсці самую старую кнігу і зрабіць з ёй фотаздымак.

Намінацыя «Візуальны сэт «VADEMECUM: ТАМ ЁСЦЬ ВЯЛІКАЯ ТАЙНА» (у перакладзе з лацінскай «vademecum» – «ідзі са мной») – своеасаблівая падарожная кніжка са створаных студэнтамі работ розных тэхнік выяўленчага мастацтва, якая з’яўляецца правадніком па жыццёваму і асветніцкаму шляхам Францыска Скарыны.

Пачатак «падарожжа» творчых разважанняў студэнтаў у 2017 годзе – у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Далей у форме інтэрактыўнай экспазіцыі рэспубліканскай культурна-асветніцкай акцыі працяг праекта ва ўстановах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь – Палескім дзяржаўным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны, Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, Полацкім дзяржаўным універсітэце, дзе адбыліся творчыя падзеі, сустрэчы ўдзельнікаў аматарскіх гурткоў, дзяцей, моладзі і прафесійных мастакоў.

Менавіта беларускія студэнты, самадзейныя аўтары, натхнёныя жыццём і дзейнасцю першадрукара, стварылі работы, якія спалучылі ў сабе мінулыя падзеі і сучаснасць каб паразважаць над духоўным развіццём чалавека і аб'яднаць моладзь еўрапейскіх універсітэтаў Кракава, Падуі, Прагі, Вільнюса, Калінінграда, каб пазнаёміцца, распавесці гісторыю ўніверсітэтаў, гарадоў і краін, з якімі былі звязаны жыццё і дзейнасць першадрукара, па-новаму асэнсаваць велічнасць чалавека ведаў, чалавека адукацыі, чалавека асветы і запаліць для сябе нераспазнаны свет дасканалага часу і дасканалага чалавека ў форме міжнароднай гістарычнай online-вандроўкі шляхамі Францыска Скарыны.

У 2018 годзе арганізатары праекта «Грані творчасці» вырашылі засяродзіцца не адной канкрэтнай гістарычнай постаці, а на тэме роднага беларускага слова, якая яднае вакол сябе вялікае мноства творцаў.

Культуралагічную аснову праекта ў 2018 годзе складае вусная народная творчасць – фальклор, самы вялікі творца беларускай культуры – сам народ, знакавы асветнік – беларуская мова, культурны падмурак – беларускія традыцыі.

Таму тэмай-дэвізам праекта ў 2018 годзе сталі словы «Магутнае слова, ты, роднае слова!» песняра беларускай літаратуры Янкі Купалы.

У рамках рэспубліканскай выставы сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў «Грані творчасці» студэнтам прапанаваны наступныя намінацыі.

Намінацыя «Летэрынг» – «Родная мова, цудоўная мова! Ты нашых думак уток і аснова!». Як вядома, летэрынг літаральна азначае «маляванне словамі», тэхніку выканання, у якой тэкст, графічныя формы і рашэнні з'яўляюцца мастацкімі аб'ектамі. А сярод канкрэтных твораў для асэнсавання – «Родная мова» Максіма Танка, «Родная мова» Пімена Панчанкі, «Матчына мова» Алеся Бачылы, «Слова» Якуба Коласа, «Роднае слова» Янкі Купалы, «Родная мова, цудоўная мова!..» Уладзіміра Дубоўкі, «Родная мова» Ніла Гілевіча, «Роднае слова» Дануты Бічэль-Загнетавай і інш.

У намінацыі «Каляровая графіка. Рэхарыфма» – «Па рэху напеваў, па голасе сэрца…» аснову творчай работы складае стылізаваны беларускі сімвал ці арнаментальны матыў з характэрных беларускіх сімвалаў. Прапанаваная аўтарам сюжэтная кампазіцыя павінна праілюстраваць змест аднаго з узораў вусна-паэтычнай ці музычнай народнай творчасці і раскрыць сакральны сэнс традыцый земляробчага ці сямейна-абрадавага календара беларусаў. Пры падрыхтоўцы работы аўтару неабходна будзе ўжыць пэўны

беларускі сімвал ці арнаментальны матыў, які тычыцца пэўнага беларускага абраду або свята. Творчая работа суправаджаецца інфармацыяй з назвай абраду, рэгіёнам і фрагментам тэксту абрадавай песні.

Аснову творчай работы ў намінацыі «Фотаальтэрнат» – «Што ў цябе ёсць, акрамя мовы, з якой складаюцца твае думкі і словы?» складае візуалізацыя рэдкаўжывальнага ў сучасным жыцці або забытага беларускага слова. Аўтарам неабходна стварыць канцэптуальны фотапартрэт з рэччу або рэпартажны фотаздымак выявы ці падзеі, які будзе з'яўляцца ілюстрацыяй да выбранага слова. А яшчэ трэба будзе суправадзіць творчую работу інфармацыяй з кароткім тлумачэннем гэтага слова.

Намінацыя «Візуальны сэт» – «Вечна жывуць у слове незлічоныя скарбы чалавечай думкі і вопыту». Тут да ўдзелу дапускаюцца аўтарскія работы ў розных напрамках і тэхніках мастацкай творчасці, традыцыйных беларускіх тэхніках народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (выцінанка, плоскасная аплікацыя, плоскаснае саломапляценне, габелен, вышыўка, ткацтва і інш.), у якіх прадстаўлена візуалізацыя алегарычных з'яў прыроды, вобразаў птушак, жывёл, герояў і сюжэтаў беларускіх міфаў, легенд і паданняў, якія знайшлі адлюстраванне ў вуснай народнай творчасці.

Пасля экспанавання ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі рэспубліканская культурна-асветніцкая акцыя «Грані творчасці» працягнецца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, Беларуска-Расійскім універсітэце, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Брэсцкі дзяржаўным тэхнічным універсітэце.

Міжнародная частка будзе рэалізавана ў форме канцэпт-ініцыятывы «Сябрына», да ўдзелу ў якой запрашаюцца студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі славянамоўных краін.

Аснову гэтай ініцыятывы складуць звароты, якія на роднай мове будуць прамаўляць студэнты, назваўшы сваю мову і імёны літаратурных дзеячаў, напрыклад: «Беларуская мова – гэта мова беларускага народа, мова пісьменніка Якуба Коласа і паэта Янкі Купалы». Такія відэазвароты будуць суправаджацца відэаздымкай панарамы ўстановы адукацыі, інтэр'ера музея літаратурнага дзеяча, гістарычных аб'ектаў, помнікаў і такім чынам будуць адлюстроўваць нацыянальныя асаблівасці краіны.

І можна не сумнявацца, што тэма нашай роднай мовы, нашых каранёў стане для студэнтаў такой жа блізкай, як і папярэднія тэмы. Акрамя таго, удзел у праекце спрыяе мэтанакіраванай творчай дзейнасці студэнтаў, пашырае кола зносін моладзі, знаёміць з мастацкімі работамі студэнтаў іншых устаноў вышэйшай адукацыі – удзельнікаў праекта, дапамагае не толькі вызначыцца і выпрацаваць свой творчы почырк, але і ўзбагацяць светапогляд.

Маладзёжная творчасць вельмі разнастайная, яна дынамічна развіваецца, выступая скаладанай сінкрэтычная з'явай. У рабоце з мо-

ладдзю творчая інтуіцыя – гэта найбольш плённы спосаб дзейнічання. Таму кожнаму творчаму кіраўніку, педагогу, арганізатару патрэбна ўмець існаваць на ўзроўні творчага прагнозу ці творчай інтуіцыі, умець прадугадаць, ці будзе гэта цікава моладзі.

Найбольш складана гэта ў плане прапановы нейкіх ідэй і асабліва ў плане работы з творчай таленавітай моладдзю, бо яна сама – рэактар ідэй, яна сама перанасычана ідэямі, і яна фарміруе сваю маладзёжную культуру. І калі мы кажам пра тое, што павінны моладзь нечым зацікавіць, трэба ўважліва прыслухацца перш за ўсё да яе самой.

Прадстаўлены практ «Грані творчасці» вельмі блізкі і зразумелы моладзі, асабіста стымулюе да творчасці матэрыял творчых заданняў блізкі кожнаму студэнту, а праца над падрыхтоўкай творчай работы стварае эмацыянальную атмасферу, спрыяльную суб'ектынаму ўспрыманню культурнай спадчыны, напаўняе інтэлектуальную і эмацыйную прастору маладога чалавека асаблівым сэнсам.

Міжнародны культуралагічны праект «Грані творчасці» – гэта новая грамадска значная падзея ў жыцці беларускага студэнцтва, якая ўжо выклікала жывы водгук ва ўстановах адукацыі, і далей будзе садзейнічаць укараненню новых падыходаў у засваенні культурнай спадчыны беларускага народа. Гэта творчая справа будзе паспяхова развівацца з падтрымкай апантаных педагогаў, кіраўнікоў калектываў, самадзейных мастакоў, маладых аўтараў, на якіх таксама накіраваны зварот Францыска Скарыны: «Ніякай працы і скарбаў ніякіх не шкадуйце для паспалітай карысці для айчыны сваёй».

*В. Э. Лук'янчук*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск, Беларусь

*V. Lukuanchuk*
Republican Institute of Higher School, Minsk, Belarus

**УДК 94(476)**

## РАМЯСТВО НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

## THE CRAFT IN BELARUS IN THE SECOND PART OF THE XIX CENTURY

*У другой палове XIX ст. назіралася далейшае развіццё рамяства па ўсіх паказчыках: колькасць прадпрыемстваў, колькасць рабочых, сума вытворчасці, павелічэнне ступені спецыялізацыі і аб'ему вытворчасці. Прычыны большай вагі рамяства на Беларусі ў параўнанні з Расіяй бачацца ў тым, што, вымушаныя сяліцца ў гарадах і мястэчках, яўрэі не мелі значных капіталаў для заснавання буйных прадпрыемстваў. Прамысловасць Беларусі спецыялізавалася на*